# Веснік Глыбоччыны

Вішнёвы фестываль
Глыбокае 2013

Газета раённага выканаўчага камітэта і раённага Савета дэпутатаў

www.vg-gazeta.by серада, 24 ліпеня 2013 года № 59 (9299)


## Дарагія сябры!

Сардэчна вітаю ўдзельнікаў і гасцей першага "Вішнёвага фестывалю" ў Глыбокім!

На Віцебшчыне ўсе добра ведаюць, што цяжка адшукаць вішні, смачней за глыбоцкія. Калісьці вішнёвыя сады ў Глыбоцкім раёне заклаў мясцовы селекцыянер Баляслаў Лапыр, які прывозіў саджанцы з Польшчы. Менавіта з яго садоў сакавітая, салодкая і зімаўстойлівая вішня трапіла спачатку ў тутэйшыя сялянскія сядзібы, а потым распаўсюдзілася па ўсім краі. Да гэтага часу вішнёвая слава Глыбокага перадаецца з вуснаў у вусны.

Варта адзначыць, што вішню любяць усюды, таму і вішнёвыя фестывалі праводзяць у многіх краінах: у ЗША такіх фестываляў два – у Вашынгтоне і Трэверсіці, у Харватыі вішнёвай сталіцай лічыцца Лаўран, у Літве – мястэчка Жагарэ, а ў Расіі – горад Уладзімір.

Як выдатна, што "Вішнёвы фестываль" становіцца яшчэ адной добрай традыцыяй нашага горада!

Я шчыра спадзяюся, што гэтае свята дасць магчымасць усім жадаючым прадставіць свае майстэрства, падзяліцца вопытам у вырошчванні вішні, у прыгатаванні смачных страў з гэтай ягады і, вядома, знайсці новых сяброў.

Упэўнены, што ўдзел у фестывалі стане важнай падзеяй у жыцці кожнага з нас.

Ад усяго сэрца жадаю ўсім удзельнікам свята творчых адкрыццяў, здароўя, натхнення, поспехаў, радасці ад сустрэч, а гасцям – незабыўных уражанняў і выдатнага настрою!

**Алег МОРХАТ,**
**старшыня Глыбоцкага райвыканкама.**



Фота Алены АДЭДЭДЖЫ.

√ З нагоды

# З днём нараджэння, фестываль!

**Глыбоччына славіцца не толькі працавітымі і таленавітымі людзьмі, але і сваімі традыцыямі, правядзеннем цікавых форм адпачынку яе жыхароў. Пры ўсім тым, ідэя правядзення ў горадзе «Вішнёвага фестывалю» нікога не пакінула раўнадушным. Аб ім упершыню загаварылі яшчэ ў студзені бягучага года. Глыбачане актыўна падхапілі ідэю. За гэты час многае было зроблена па рэалізацыі праекта ў жыццё: створаны арганізацыйны штаб, які ўзначаліў сам кіраўнік раёна, распрацаваны чатыры варыянты лагатыпаў фестывалю. З іх метадам галасавання выбраны Вішні-ноткі, якія найбольш удала асацыіруюцца з весялосцю, урачыстасцю і музычнасцю «Вішнёвага фестывалю».**

***Аб гісторыі ўзнікнення праекта і яго далейшым увасабленні ў жыццё павядзём размову з намеснікам старшыні Глыбоцкага райвыканкама па сацыяльных пытаннях, намеснікам старшыні арганізацыйнага штаба па падрыхтоўцы і правядзенні «Вішнёвага фестывалю» на Глыбоччыне Галінай Унуковіч.***



**—Галіна Уладзіміраўна, фестываль крочыць па глыбоцкай зямлі. Каму належыць ініцыятыва яго стварэння і чаму менавіта «Вішнёвы», а не «Яблычны»ці «Слівовы», напрыклад?**

—У снежні мінулага года ў Мінску праходзіў трэці Міжнародны форум «Імідж Беларусі: час дзейнічаць». У рамках форуму адбыўся конкурс творчых работ па брэндзінгу Рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь. Удзел у ім прыняў і аддзел фізічнай культуры, спорту і турызму нашага раёна. Ён прадставіў на конкурс праект «Вішнёвы фестываль у Глыбокім». Праект быў высока ацэнены журы: па выніках конкурсу ён заняў другое месца.

Наш горад здаўна славіўся сваімі садамі. Некалі тут былі два манастырскія сады -- кармеліцкі і базыльянскі, сад у маёнтку Масальскага (як памяць пра гэта -- вуліца Садовая).

У польскія часы ва ўсёй акрузе ведалі агранома Баляслава Лапыра, які вырошчваў свае сарты вішань. «Лапыровы вішні» вельмі распаўсюджаны на Глыбоччыне. У параўнанні з іншымі сартамі яны больш устойлівыя да зімовых халадоў, больш салодкія і сакавітыя. На аснове «глыбоцкай вішні» выведзены многія сарты пасляваеннай селекцыі гэтай культуры. Сёння вішнёвых садоў у раёне шмат. Бадай у кожным двары не толькі сельскіх населеных пунктаў, але і жыхароў горада можна бачыць вішнёвыя дрэвы. Вішня была і застаецца брэндам нашага горада. Таму і прадстаўлены на конкурс праект не выпадкова ўславіў вішню.

***Наш горад здаўна славіўся сваімі садамі. Некалі тут былі два манастырскія сады -- кармеліцкі і базыльянскі, сад у маёнтку Масальскага (як памяць пра гэта -- вуліца Садовая).***

Яшчэ мы зыходзілі з таго, чым рэальна багатыя. Маючы не толькі сельскагаспадарчую вытворчасць, але і шырокую вытворчую сферу, у нас ёсць магчымасць перапрацоўкі вішні ў любым выглядзе, як на прадпрыемствах кансервавага завода «КупцовЪ», малочнакансервавага камбіната, так і на хлебазаводзе і вінзаводзе. Ёсць магчымасць выпуску інавацыйнай прадукцыі. Сёння мы адыходзім ад пладова-ягадных напіткаў і пачынаем выпуск вінных вырабаў палепшанай якасці, дзе віно з вішні ўжо заявіла аб сабе.

**—Як вялася падрыхтоўка да правядзення «Вішнёвага фестывалю»?**

—У мэтах аператыўнага рашэння пытанняў падрыхтоўкі горада і саміх святочных мерапрыемстваў да правядзення «Вішнёвага фестывалю» ў адпаведнасці з рашэннем раённага выканаўчага камітэта быў створаны штаб. Акрамя пытанняў добраўпарадкавання і закладкі вішнёвага саду трэба было прапрацаваць праграму святочных мерапрыемстваў, якія будуць доўжыцца тыдзень, вызначыцца з вырабам сувенірнай прадукцыі, падумаць аб тым, як яе Вялікасць Вішаньку прадставіць у манументальна-дэкаратыўнай скульптуры і вырашыць многія арганізацыйныя пытанні.

**—Чым цікавым парадуе першы «Вішнёвы фестываль" і ці стане ён брэндам раёна?**

—Як і планавалася, галоўнай пляцоўкай правядзення фестывалю стала Цэнтральная плошча горада, святочнымі мерапрыемствамі задзейнічаны дзіцячая пляцоўка і плошча «17 Верасня», гарадскі цэнтр культуры і цэнтральная раённая бібліятэка… У ходзе фестывалю пройдзе навукова-практычная канферэнцыя для садаводаў-аматараў, удзельнікамі якой будуць спецыялісты па селекцыі вішні, раскажуць і пакажуць якія яе сарты выведзены, дадуць поўную інфармацыю па іх, правядуць кансультацыі па ўсіх цікавячых пытаннях, якія датычацца пасадкі і догляду за вішняй.

У рамках фестывалю пройдзе шмат цікавых конкурсаў, арганізуюцца творчыя і турыстычныя выставы, прэзентацыі і спартыўныя праграмы. У чарговы раз сваёй творчасцю парадуюць майстры народнай творчасці Глыбоччыны і пройдзе агляд-конкурс падвор'яў, урачыстая рэгістрацыя шлюбу, выступіць калектыў мастацкай самадзейнасці з Латвіі, і гэта далёка не поўны пералік тых мерапрыемстваў, якія ўключае праграма фестывалю. Будуць праведзены вішнёвыя кірмашы і продаж прадукцыі з вішні. Па сутнасці, «Вішнёвы фестываль» -- гэта свята ўраджаю вішні.

Адным са значымых момантаў фестывалю абяцае быць адкрыццё ў горадзе манументальна-дэкаратыўнай скульптуры «Вішанька».

У рамках мерапрыемства з 26 па 27 ліпеня будзе праводзіцца інвестыцыйны форум. Спадзяёмся, што гэта паспрыяе нашым прадпрыемствам наладзіць больш цесныя партнёрскія сувязі з прадстаўнікамі замежных краін у плане рэалізацыі новых інвестыцыйных праектаў і пастаўкі глыбоцкай прадукцыі на замежныя рынкі.

Да правядзення фестывалю актыўна падключыўся прафсаюз работнікаў дзяржаўных і іншых устаноў раёна. Яго прадстаўнікі ўдзельнічалі ў пасадцы вішнёвага саду ў красавіку бягучага года. Першымі ўнеслі свой уклад ва ўстаноўку вішнёвай кампазіцыі, прынялі ўдзел у афармленні падвор'я, арганізацыі дабрачыннага кірмашу. Да фестывалю раённая прафсаюзная арганізацыя работнікаў дзяржаўных і іншых устаноў прыўрочыла і святкаванне пяцідзесяцігоддзя з дня свайго заснавання.

***Адным са значымых момантаў фестывалю абяцае быць адкрыццё ў горадзе манументальна-дэкаратыўнай скульптуры «Вішанька».***

Фестываль абяцае быць цікавым і насычаным. Удзел у ім прымуць госці з Літвы, Латвіі, Галандыі, Расіі, Польшчы, Арменіі, Ізраіля, Германіі і Малдовы.

А што датычыцца таго, ці стане «Вішнёвы фестываль» брэндам раёна, то я ў гэтым ніколькі не сумняваюся. Няхай яго нараджэнне дарue фестывалю доўгае жыццё, цікавыя знаходкі, цёплыя сустрэчы. А наша Глыбоччыны патанае ў квецені вішнёвых садоў.

З нараджэннем, фестываль!

**Да друку падрыхтавала Ганна КАПШУЛЬ.**







## Вішанькі-ноткі ў лідарах

На жаль, падчас галасавання ў нашай раённай газеце чатыры варыянты лагатыпаў да “Вішнёвага фестывалю” змяшчаліся ў чорна-белым адлюстраванні. Але ёсць магчымасць у святочным фестывальным нумары гэтыя ж лагатыпы ўбачыць у колеры. Як вядома, Вішанькі-Ноткі пад №2 сталі пераможцамі галасавання і на інтэрнэт-сайце “Весніка Глыбоччыны”, і падчас тэлефонных званкоў у рэдакцыю.

## Квітней, вішнёвы сад!



30 красавіка гэтага года адбылася вось гэтая сімвалічная падзея, якая пацвердзіць, што Глыбокае – вішнёвая сталіца, праз колькі гадоў, спадзяёмся, небывалым ураджаем ягад. Вялікі вішнёвы сад, закладзены пры ўездзе ў горад з боку вёскі Арэхаўна, стане сімвалічнай брамай для гасцей і жыхароў раёна. 1414 маленькіх дрэўцаў, пасаджаных у падарунак любімаму гораду напярэдадні “Вішнёвага фестывалю”, у наступным юбілейным годзе ўвесну ўжо парадуюць квеценню незвычайнай прыгажосці, гасцінна запрашаючы кожнага на юбілей Глыбокага. Расці, вішнёвы сад, квітней “Вішнёвы фестываль”!



√ Наша знаёмства

# Садоўнік, сад і... “капрызная панначка”



Садоўнік з Падсвілля Уладзімір Бурэнь.

**Пасадзіць дрэва ці, скажам, цэлы сад – толькі пачатак справы. Далей пачынаецца догляд, а гэта не азначае, як падаецца многім, толькі збор ураджаю. Патрабуецца пастаянная, з года ў год, карпатлівая, патрабуючая і спецыяльных ведаў, і настойлівасці, і поўнай самааддачы напружаная праца. На такое здольны чалавек апантаны, улюбёны ў справу, улюбёны ў сад. Рыхтуючыся да “Вішнёвага фестывалю”, карцела пазнаёміцца з такім садоўнікам. Аказалася, не так ужо і многа ў раёне людзей, якія на прафесійным узроўні займаюцца вырошчваннем, доглядам і рэалізацыяй саджанцаў яблынь, груш і вішань. І адзін з іх – падсвільчанін Уладзімір Бурэнь.**

Наша сустрэча адбывалася вясной. Яшчэ была самая пара займацца пасадкай маладзенькіх дрэўцаў. Дом, дворык, уся сядзіба ў атачэнні квецені: раскашавалі вішні, яблыні, слівы... Прыгожа, утульна... І размаўлялі пад пошчакі салаўя (вуліца Гарадзішчанская знаходзіцца на ўскрайку Падсвілля).

Садоўніцтва для Уладзіміра Уладзіміравіча і Таццяны Аляксееўны Бурэняў за апошнія больш, чым дзесяць гадоў стала справай сямейнай.

—Дзед мой родам з Сялют, ляснікам працаваў, — расказвае Уладзімір. – Хутчэй ад яго нейкія гены, любоў да дрэў, да прыроды перадаліся. Хаця ў большай меры садаводства для мяне – вялікае захапленне. Каб гадоў трыццаць таму хто сказаў, што буду дагледаць і рэалізоўваць саджанцы пладовых дрэў, нізашто не паверыў бы. Але пачатак ліхіх 90-ых прымусіў памяняць уклад жыцця. Трэба было карміць сям'ю, круціўся як мог. Неяк выпадкова сустрэлі з жонкай яе былую аднакурсніцу з мужам. Даведаліся пра іх фермерскую гаспадарку, пра тое, што займаюцца рэалізацыяй саджанцаў пладовых дрэў. І неяк адразу мільганула думка: а чаму б і нам не ўзяцца. Узбагацімся ведамі, вопыт справа – нажыўная, а працы мы не баімся. А калі з любоўю ўсё рабіць, то і камень зацвіце.

З таго часу Уладзімір Уладзіміравіч і Таццяна Аляксееўна з галавой акунуліся ў новую справу, заклалі гадавальнік, наладзілі сувязь з базавымі гаспадаркамі, якія займаюцца развядзеннем пладовых дрэў. Сёння да іх едуць людзі з усіх месцаў Глыбоччыны, з суседніх раёнаў, і не толькі, каб набыць саджанцы, а і атрымаць карысную параду. Садоўнік ахвотна дзеліцца сваімі набыткамі і сакрэтамі.

—Праца на зямлі, у полі ці ў садзе, патрабуе поўнай самааддачы, — перакананы Уладзімір Бурэнь. – На вырошчванне паўнацэннага саджанца спатрэбіцца 2-3 гады. Адно прывіць, зрабіць падкормку, паліваць. А як трэба абараніць кожнае дрэўца і ад рознай тлі, ненажэрных вусеняў, ад хвароб, і ад шэрых мышэй, і ад самых злосных ворагаў садоў – зайцоў! Да ўсяго, наша кліматычная зона для садаводства вельмі рызыкоўная. І асабліва для костачкавых (сліў, вішняў, чарэшні). Уявіце: люты месяц ці сакавік – два тыдні адліга, цяпло. Гэта ж рух соку пайшоў, а тут раптам – моцны мароз. Стрэс для дрэўцаў страшны. А вішня, асабліва чарэшня – вельмі “капрызная панначка”. Таму лепш набываць і расціць саджанцы айчыннай селекцыі, напрыклад, чарэшню гронкавую альбо сюбараўскую. Яны больш стойкія за ўсе імпартныя.

Вестка пра тое, што ў Глыбокім адбудзецца “Вішнёвы фестываль” самым непасрэдным чынам паўздзейнічала на запыты пакупнікоў. Імгненна павялічылася колькасць жадаючых набыць саджанцы вішні і чарэшні. Сёлетняй вясной, калі яшчэ снег не растаяў, Уладзімір Уладзіміравіч ледзь адбіваўся ад тэлефонных званкоў. Умомант раскупілі саджанцы “капрызнай панначкі”. Гэтая акалічнасць асабліва парадавала садоўніка, і не столькі з-за таго, што павялічыўся попыт і яго даход, колькі з-за таго, што больш стане ў нашым краі вішнёвых насаджэнняў, як папрыгажэюць вёснамі ад белай квецені, а ўлетку ад наліўной чырвані гаспадарскія сядзібы, і як у кожнай сям'і будуць радавацца багатаму ўраджаю духмяных, салодкіх ягад, нарэшце, як наробяць людзі з іх розных прысмакаў і, каштуючы, будуць згадваць пра садоўніка, які ўзрасціў вішаньку. Падумае пра гэта Уладзімір Уладзіміравіч і яшчэ з большай ахвотай акунаецца ў паўсядзённую нялёгкую работу садоўніка.

**Анатоль ЗІНКЕВІЧ.**
**Фота Алены АДЭДЭДЖЫ.**

√ Гісторыя і сучаснасць

## *Каб заўсёды квітнелі сады на Глыбоччыне*



***“Калі я працую падоўгу, без стомы, тады думкі лягчэй, і здаецца, што мне вядома, для чаго я існую”. Гэтыя радкі з бессмяротнага твора Антона Паўлавіча Чэхава “Вішнёвы сад” як нельга лепш падыходзяць да жыцця выдатнага чалавека, Героя Сацыялістычнай працы Максіма Аляксандравіча Клімянка, які пражыў доўгіх дзевяноста гадоў.***

Нарадзіўся Максім Аляксандравіч у 1902 годзе ў в. Ніжнія Жары (Брагінскі раён, Гомельская вобласць). У свой час яму даводзілася ўзначальваць розныя гаспадаркі: калгасы імя Кірава, “Рухавік рэвалюцыі” і іншыя Брагінскага раёна, “Адраджэнне” Карагандзінскай вобласці.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны, у 1943 годзе, М. А. Клімянок прызначаны камісарам партызанскага атрада, праз колькі часу – партызанскай брыгады імя Калініна, якая дзейнічала на тэрыторыі Міёрскага, Дзісненскага, Шаркаўшчынскага, Браслаўскага раёнаў.

Пасля вызвалення Міёрскага раёна Максім Аляксандравіч два гады ўзначальваў райвыканкам. Скончыўшы Горацкую школу аграномаў, працаваў загадчыкам Глыбоцкага райсельгасаддзела.

У 1953 годзе М. А. Клімянок з пасады старшыні райвыканкама пайшоў працаваць старшынёй калгаса імя Чапаева Глыбоцкага раёна і пераехаў жыць у в. Верхняе. Максім Аляксандравіч -- чалавек са складаным лёсам, усё, за што ён браўся, рабіў з вялікім задавальненнем і ва ўсім дабіваўся поспеху. Пад яго кіраўніцтвам калгас імя Чапаева стаў адной з вядучых гаспадарак раёна: у Верхнім былі пабудаваны васьмігадовая школа, Дом культуры, стадыён, бібліятэка, магазін, лазня, ФАП, швейная майстэрня.

А яшчэ гэты цудоўны чалавек вельмі любіў зямлю, клапаціўся аб ёй як добры гаспадар. Пад кіраўніцтвам М. А. Клімянка быў закладзены яблыневы сад, які і па сённяшні дзень радуе ўсіх сваёй прыгажосцю. Калі Максім Аляксандравіч пайшоў на заслужаны адпачынак, ён не змог сядзець склаўшы рукі і заняўся развядзеннем “войлачнай” вішні. Ён з'ездзіў на радзіму, прывёз насенне і засадзіў вішнямі 10 сотак свайго агарода. Калі насенне ўзышло, Максім Аляксандравіч раздаваў саджанцы людзям. Ён хацеў, каб на яго зямлі заўсёды цвілі сады.

У 1966 годзе за дасягнутыя поспехі ў развіцці ўсіх галін сельскай гаспадаркі М.А. Клімянок удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы. Таксама быў узнагароджаны многімі ордэнамі і медалямі, сярод якіх ордэн Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, ордэн Леніна і многія іншыя.

**В. БАХІР,**
**галоўны захавальнік фондаў Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музея.**

√ Даведка

### Вішня “войлачная”

***З Кітая культура распаўсюдзілася па свеце, а ў канцы XIX стагоддзя дабралася да расійскіх межаў. З'яўленнем на тэрыторыі былога СССР яна абавязаная Івану Мічурыну. Войлачнай жа яе называюць з-за пуху на лісці і пладах. У такой вішні маса добрых якасцей: дэкаратыўнасць, высокая марозаўстойлівасць, стабільная ўраджайнасць, ранняе пладанашэнне. Акрамя таго, гэтая вішня не толькі ўпрыгожвае сад ранняй вясной і прыносіць плады летам, яе кусты з густой разгалістай кронай падыходзяць для стварэння жывых агароджаў, бардзюраў, імі можна ўмацоўваць схілы.***

**Садовыя вуліцы Глыбокага... Іх усе, вулачкі і завулачкі, сапраўды можна так назваць. У кожным дворыку, ля кожнай сядзібы – яблыні, грушы, але найбольш усё ж такі вішань. Дрэўцы звешваюць свае галінкі праз агароджу да дарогі так, што прахожыя могуць адшчыкнуць смачную ягадку на хаду. Як вядома, Глыбоччына здаўна і па сённяшні час славілася садамі, як і сваімі садаводамі. Пра іх і размова...**

## Баляслаў Лапыр. Вішнёвыя традыцыі жывуць

***Запасіцся ў ліпені глыбоцкімі вішнямі з'язджаюцца рупныя гаспадары і гаспадыні ці не з усёй Беларусі. Вішнёвая слава Глыбокага множыцца з кожным годам і, як вядома, вядзецца з “польскіх часоў”. Мясцовыя старажылы памятаюць, што ў садзе агранома Баляслава Лапыра, які прывозіў высадкі з Польшчы, ох, і смачныя збіраліся вішанькі. А паколькі для тутэйшых сялян ён не шкадаваў анічога, то, несумненна, і разрасталіся “лапыровы” вішні ў кожным двары, а потым пашыраліся па ўсім краі.***



Пра слыннага агранома на Глыбоччыне замовім колькі слоў. Нарадзіўся Баляслаў Лапыр 5 мая 1895 года ў Пецярбургу. Паколькі бацька Нікадзім паходзіў з вёскі Рубеж Браслаўскага павета, то і ў пачатковай школе яго сын вучыўся ў Браславе. Адукацыю Баляслаў працягваў у Коўна, потым у Пецярбургу, дзе ў 1916 годзе закончыў навучальную ўстанову са спецыяльнасцю агранома.

У 1926 годзе ажаніўся са Стэфаніяй Страшэвіч. У гэтым жа годзе маладая сям'я набыла 11 гектараў зямлі ля Глыбокага.

Працуючы доўгі час на пасадзе павятовага агранома, ён з'яўляўся дарадчыкам і памочнікам для простых людзей у пытаннях сельскай гаспадаркі. У нашых вёсках арганізоўваў і праводзіў аграномічныя курсы, з'яўляўся ініцыятарам правядзення сельскагаспадарчых выстаў. Ёсць меркаванне, што менавіта ім было выведзена некалькі новых гатункаў садовых дрэў, у тым ліку і вішнёвых.

Баляслаў супрацоўнічаў са многімі перыядычнымі выданнямі, пісаў артыкулы сельскагаспадарчай тэматыкі для часопісаў “Tygodnik Rolniczy”, “Plon” і інш., выступаў у перадачах на віленскім радыё.

Баляслаў Лапыр быў арганізатарам і ўдзельнікам розных фальклорных гуртоў, удзельнічаў у тэатральных пастаноўках мясцовай інтэлігенцыі. Ён вельмі шанаваў родную мову і з сялянамі, і ў сям'і размаўляў толькі па-беларуску.

У першыя гады Вялікай Айчыннай вайны Баляслаў Лапыр жыў у Глыбокім, многіх мястэчкоўцаў выратаваў ад выгнання ў Германію, але ў верасні 1943 года вымушаны быў пераехаць з сям'ёй туды, дзе прадаўжаў сваю справу: выводзіў новыя гатункі збожжа ў маёнтку Granzkevitz.

У красавіку 1945 года сям'я Лапыроў вярнулася ў СССР, дзе была арыштавана і апынулася ў лагеры горада Ваўкавыска. Пасля аднаго з допытаў Баляслаў Лапыр не вярнуўся. Лёс яго невядомы. Жонка і дзеці ўжо пад прозвішчам Страшэвіч выехалі ў польскі Гданьск на пастаяннае месца жыхарства.




Толькі памяць пра “харошага, душэўнага, інтэлігентнага” агранома Баляслава Лапыра, такім згадваюць яго глыбоцкія старажылы, яшчэ жыве. І, несумненна, “Вішнёвы фестываль” гэтаму пацвярджэнне.

**А. ХАЙНОЎСКІ,**
**старшы навуковы супрацоўнік раённага гісторыка-этнаграфічнага музея.**
**Фота з інтэрнэт-рэсурсаў.**

# У Глыбокім будзе вуліца Вішнёвая

**У Глыбокім сёння налічваецца 138 вуліц. У іх назвах захавана гісторыя краіны і нашага раёна, занатаваны імёны славутых землякоў і людзей, дзейнасць якіх прыносіла пазітыўныя змены; у вуліцах – напрамкі свету і геаграфічныя назвы, прыродныя адметнасці, характэрныя глыбоцкаму краю.**





Вуліцы Вольная і 3 ліпеня, Народная і Славянская, Францыска Скарыны і Язэпа Драздовіча, Міра і Маладзёжная, Кастуся Каліноўскага і Фамы Ляшонка, Віктара Ламакі і Максіма Клімянка, Паўночная і Заходняя, Радужная і Сонечная, Палявая і Лугавая... А цяпер у праектах з'явілася і вуліца Вішнёвая, якая будзе размешчана ва ўсходняй частцы горада, перпендыкулярна вуліцы Радужнай. Фактычна яна з'явіцца працягам вуліцы Астроўскага і будзе суседнічаць з нядаўна пасаджаным вішнёвым садам.

— На дадзеным этапе вядуцца праектныя работы. Затым будуць пракладвацца інжынерна-транспартныя камунікацыі. Пры наяўнасці фінансавання ўжо налета, да 600-годдзя Глыбокага, там, магчыма, будуць выдзяляцца зямельныя ўчасткі пад будаўніцтва, — гаворыць галоўны архітэктар раёна Аляксандр Латышонак. – Вуліца разлічана на 39 прыватных домаўладанняў. Вішнёвая вуліца, як і Полацкая, што ў бліжэйшы час з'явіцца ў Глыбокім і названая ў гонар 1025-годдзя з Дня хрышчэння Русі, "нараджаецца" з нагоды правядзення «Вішнёвага фестывалю» ў Глыбокім.

**Галіна СУТУЛА.**

**26 ліпеня 2003 года заключылі шлюб Мікалай і Марына Барысёнкі, Уладзімір і Алеся Рымкевічы, Ігар і Жанна Усовічы. У той жа дзень 2007 года справілі рыцарскае вяселле Віктар і Юлія Дыро, 28 ліпеня – Васіль і Зоя Сасноўскія. За час, які прайшоў з дня вяселляў, у маладых сем'ях нарадзіліся дзеці, а ў Ігара і Жанны Усовічаў – двайняткі Максім і Кірыл, якім сёлета ў Дзень Перамогі 9 мая споўнілася па чатыры гады. Самі таго не ведаючы, усе пералічаныя пары трапілі ў святочны вішнёвы фестывальны летапіс. А ў наступных маладажонаў дата шлюбу, выпадкова ці не, паднеслася прама пад вішнёвы фестываль. Напярэдадні яго, 20 ліпеня, мужам і жонкай стануць Дзмітрый і Ганна Марговічы, Аляксандр і Ірына Лісаевічы, Аляксандр і Вольга Ільінчыкі, Артур і Валянціна Шнітко, Віктар і Ірына Крыўко. 26 ліпеня вяселлі адгуляюць Сяргей і Святлана Лось, докшыцкія маладажоны Аляксандр і Алёна Нехвядовічы, шаркоўшчынска-глыбоцкая пара Віктар і Ала Сіповічы. 27 ліпеня ў Глыбокім пройдзе ўрачыстая шлюбная цырымонія, у якой прымуць удзел шэсць пар. У ліку іх — Алег і Юлія Раманчукі, Дзяніс і Анастасія Сарока, Аляксандр і Людміла Белыя, Сяргей і Ірына Сініцы, Яўген і Марыя Русакі, Аляксандр і Ірына Сіўко. Ім, маладым, пачынаць сумесны шлях, вучыцца дзяліць жыццё напапалам, упрыгожваць сваімі пачуццямі паўсядзённыя будні. А мы раскажам пра сям'ю, якая ўжо адолела першую сумесную, пяцігадовую, дыстанцыю і ўжо мае ўласны вопыт і канкрэтныя планы на будучыню.**

# "Горкі" смак спелых вішняў



**Віктар Адамовіч з жонкай Насцяй і сынам Кірылам. Ліпень 2013 года. Час, калі ў Глыбокім спеюць вішні.**

У Віктара Адамовіча і Насці Кучаравенкі была прыгожая і рамантычная "неонавая" сустрэча, пасля якой яны пачалі адкрываць для сябе адзін аднаго. Абое сур'ёзныя і адказныя людзі, яны не спяшаліся з афіцыйным афармленнем адносін. Сустракаліся, хадзілі ў госці адзін да аднаго, дзяліліся думкамі і марамі. Тры гады прайшло перш чым абодва пераканаліся, што побач не проста выпадковы чалавек, якому прыйшоў час уступаць у шлюб, а надзейны спадарожнік, якому можна даверыць і сваё сэрца, і свой лёс, і выхаванне дзяцей.

Дату вяселля маладажоны прызначылі на 21 ліпеня 2007 года. І калі б тады ў Глыбокім праводзіўся «Вішнёвы фестываль», сям'я Адамовічаў аказалася б у эпіцэнтры святочных падзей.

А ў іх было звычайнае, па глыбоцкіх мерках, вяселле: каля васьмі дзясяткаў гасцей, вянчанне ў касцёле Святой Ганны ў вёсцы Мосар, наказ Ёзаса Булькі кахаць і даравадь, жывая арганная музыка, кветкі, падарункі, пажаданні.

Пяць гадоў праляцелі неўпрыкмет. За гэты час Віктар Адамовіч, супрацоўнік, а пазней начальнік аддзела крымінальнага вышуку Глыбоцкага РАУС, завочна закончыў Акадэмію МУС, кар'ерна "падрос" да першага намесніка начальніка Глыбоцкага райаддзела міліцыі. Акрамя спраў службовых Віктар у вольны час займаўся справамі гаспадарчымі. Узяў зямельны ўчастак, пачаў будаваць дом. Ён, вясковы хлопец, вырас у сям'і, дзе выхоўваліся шасцёра дзяцей, не цураўся і не баяўся ніякай чарнавой работы і многае ўмеў. Ёсць час – ён і сталяр, і тынкоўшчык, і цясляр, і забеспячэнец. Калі трэба – Насця дапаможа. Яна і малаток у рукі возьме, і "падсобнай" рабочай у мужа з задавальненнем папрацуе. Будуюць жа свой дом, у якім, магчыма, налета ўжо справяць наваселле.

Галоўны здабытак пражытых Насцяй гадоў у шлюбе той, што яна стала мамай і падарыла мужу сыночка Кірыла. А ў астатнім – усё як і ва ўсіх: працавала ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама, стварала ўтульнасць у доме, гатавала, мыла, агарод дагледзяла. Сям'я гектараў зямлі не мае, але тыя соткі, што за домам, дагледжаныя па-гаспадарску.

Бацькі Віктара – вяскоўцы, маглі б які мяшок бульбы дзецям падкінуць, але маладыя стараюцца забяспечыць сябе самі. І цяпер ужо ядуць сваю свежую бульбачку, цыбулю, агуркі і памідоры з парніка. А ў двары – вішня ў гронках пераспелых ягад...

— Дом дабудоўваю, дрэў каля яго насаджу, сын нарадзіўся, лічыце, праграму-мінімум выканаў, — смяецца задаволены тата, гушкаючы сына. – А калі сур'ёзна, то на перспектыву з Насцяй мы шмат чаго напланавалі. Справім наваселле – падумаем пра браціка ці сястрычку для Кірыла, дом мэбляй будзем абстаўляць, у двары парадак наводзіць...Хачу бацькоў з вёскі перавезці ў горад, бо гады ў іх не маладыя, а ў вёску ім на дапамогу не заўсёды даедзеш.

Насця ківае мужу, паказваючы сваю згоду з планамі. Нешматслоўная, абаяльная, далікатная, сціплая і, па словах мужа, "такая правільная ва ўсім", яна выдатна "адчувае" і разумее мужа. Ведае, калі дзе і што трэба сказаць, калі падтрымаць, калі атуліць ласкаю і супакоіць, калі прамаўчаць.

За пяць сумесна пражытых гадоў абое зразумелі, што ўзаемаразуменне, узаемападтрымка, вернасць, надзейнасць, клопат і давер – гэта тыя галоўныя якасці, якія, як добры цэмент, мацуе сямейную "кладку" і гарантуе ёй бясконца доўгі і шчаслівы век.

У дзень нараджэнняў і юбілеяў, на Каляды і ў Вялікдзень у Адамовічаў збіраюцца родныя — ні многа, ні мала — каля дваццаці чалавек: вялікая сям'я, дзе кожны адчувае сябе любімым і патрэбным.

Жадаем, каб каханне Віктара і Насці на працягу ўсяго жыцця было, як тое золата, найвышэйшай пробы, каб ім абаім было заўсёды "горка" ад пацалункаў, у якіх — смак спелых сакавітых ліпеньскіх вішань.

**Галіна СУТУЛА.**
**Фота Алены АДЭДЭДЖЫ.**

# Сталічная вядомасць вёскі Мярэцкія

Тое, што Глыбокаму па праву нададзены статус вішнёвай сталіцы – факт бясспрэчны. А калі браць у маштабе шырэйшым, то ўся наша прыгожая Глыбоччына здаўна завецца вішнёвым краем. Ды вось тут узнікае пытанне: "А якая тады самая вішнёвая вёска ў нашым раёне?" Упэўнены, прэтэндэнтаў на гэтае ганаровае званне знойдзецца не адзін дзясятак. У кожным сельсавеце па некалькі намінантаў вылучаць, толькі конкурс аб'яўляй. Відавочна, каб вызначыць самы "патанаючы" ў вішнёвай квецені сельскі населены пункт, спатрэбяцца выпрацоўка пэўных крытэрыяў і, безумоўна, час. Проста ўпэўнены, к гэтаму мы прыйдзем, бо «Вішнёвы фестываль» у Глыбокім пасяму абяцае стаць традыцыйным, таму дойдзе некалі чарга і да вызначэння самай прыгожай вішнёвай вёсачкі.

А сёння асмелімся ўзяць на сябе адказнасць назваць адной з самых вішнёвых вёску Мярэцкія, што ў Удзелаўскім сельсавеце. Ну, напэўна, таму, што яна з'яўляецца прыгарадам вішнёвай сталіцы. А ў большай меры таму, што вішня сапраўды раянірыецца тут здаўна, расце ля кожнага дома.

На цэлыя два кіламетры, з поўдня на поўнач працягнулася ўздоўж бойкай аўтамагістралі гэтая досыць густанаселеная вёска. Даўно прыкмецілі яе мінчане. Кіруючыся на адпачынак на Браслаўскія азёры, яны адразу заўважылі, наколькі многа ў тутэйшых мясцінах вішняў ды яшчэ самай рознай садавіны. Неаднойчы ў грамадскім транспарце, ды нават і на сталічных праспектах даводзілася чуць: "Ёсць ля Глыбокага самая доўгая вёска, дзе, лічы, з кожнага двара вішнямі гандлююць". Так, урэшце, яно і ёсць: у сезон выспявання па некалькі вёдзер з налітымі ягадамі выстаўляюць гаспадары на ўзбочыне шашы. Працэс прыдарожнага гандлю доўжыцца да глыбокай восені. Кошыкі з садавінай, гароднінай розныя – неад'емны элемент мясцовага вясковага пейзажу.

А пачынаецца гэты прыдарожны гандаль менавіта з рэалізацыі клубніц, парэчак і вішань. Асабліва ён бойкі з пятніцы па нядзелю. Не трэба і на рынак ехаць, імчаць легкавушкі-іншамаркі, ды не прамінуць іх пасажыры, каб не купіць сакавітых вішняў.

**А. УСЦІНАЎ.**
**Фота Алены АДЭДЭДЖЫ.**




*Ну і чым вам, паважаныя чытачы, ні вішнёвая вёска! Тым больш слава пра смак мярэцкаўскіх вішняў дакацілася да самай сталіцы.*

## *Якая з вішанек самая смачная?*



На фотаздымку адлюстраваны момант, як смачнымі ягадкамі ласуецца глыбачанін Максім Харэвіч. Яго бацька, Васіль, сфатаграфаваў "шчаслівае імгненне лета", каб паўдзельнічаць з гэтым і іншымі фотакадрамі ў вернісажы "Вішнёвая мяцеліца". Больш здымкаў, як Васіля Харэвіча, так і іншых вядомых і невядомых глыбоцкіх аматараў фатаграфіі можна ўбачыць на згаданай выставе ў гарадскім цэнтры культуры.

***Глыбоцкае райспажыўтаварыства як след падрыхтавалася да "Вішнёвага фестывалю". Вядома, што і раней на паліцах крам можна было ўбачыць яго салодкую прадукцыю: торты, пірожныя, жэле, упрыгожаныя вішанькамі. Убачылі смачную прэзентацыю "Вішнёвага фестывалю", прадстаўленую Глыбоцкім райспажыўтаварыствам, і годна ацанілі кулінарныя вырабы госці і ўдзельнікі "Славянскага базару ў Віцебску".***

***Настаў і ў Глыбокім час адчуць смак і водар ягадак салодкай прадукцыі ад кулінараў райспажыўтаварыства, і такая магчымасць з'явілася ў нядзелю падчас адкрыцця выставы "Вішнёвы рай", якая прайшла ў супермаркеце "Цэнтральны". Кожны фестывальны дзень – вішнёвая ягадка будзе ў цэнтры ўвагі глыбоцкіх кандытараў, якія і ў апошні дзень свята парадуюць смакатой аматараў слодычы падчас выставы-продажу прысмакаў у кулінарыі "Хозяюшка". Смачна есці, паважаныя госцейкі!***

## Калі ласка, да «вішнёвага» стала!



## Заготовительный сезон в разгаре

Глубокское РАЙПО с наступлением заготовительного сезона и в связи с проведением вишнёвого фестиваля провело мероприятие по заготовке вишни.

— В запасе у нас 300 килограммов вишни, которую заморозили и будем использовать в качестве начинки при приготовлении различных кулинарных блюд, — говорит заместитель председателя правления по заготовкам и внешнеэкономической деятельности Глубокского РАЙПО Елена Боровик. – Сладкие кушанья планируем реализовывать во время проведения «Вишнёвого фестиваля». Заготовленного объёма должно хватить на эти цели. Кроме этого, намерены заготовить дополнительно ещё одну тонну вишни, которую также заморозим, а в зимнее время будем продавать населению. Уверена, что данный товар найдёт на глубокском потребительском рынке спрос.

Вишни от населения Глубокским РАЙПО принимаются во всех торговых точках предприятия, находящихся в сельской местности, а также в городском магазине «Дары природы».

**Андрей ПАНКРАТ.**



## Ва ўсёй красе

**вішанькі парадуюць пакупнікоў ледзь не ў кожнай глыбоцкай краме. Шмат сувеніраў і неабходных рэчаў для гаспадыняў можна знайсці ў магазіне «Глобус», што на вуліцы Маскоўскай.**



**«Вішнёвы» тэкстыль і посуд вам прапануе магазін «Лянок» Глыбоцкага райспажыўтаварыства.**



## Ïàç³òû¢íûÿ ÿãàäê³

Знайсці "апетытныя" вішанькі ў Глыбокім можна проста на тратуары. Гэта вынік праекта "Пазітыўныя дарогі", рэалізаваны ў мінулым месяцы маладымі аматарамі мастацтва. Нагадаем, што ўпершыню пра гэты праект загаварыла Анастасія Развадоўская падчас конкурснай праграмы, у якой удзельнічалі маладыя лідары з Глыбоччыны, будучыя кіраўнікі. Вынікі – відавочныя...



**Яўгенія Рубашка з Цэнтра дзяцей і моладзі ягадкамі ўпрыгожвае "вішнёвую" лялькu, якую, як і іншыя падобныя, адмыслова для фестывалю стварыла Ірына Пачкоўская.**

## Вішня чырванее не толькі ў садах

У Глыбокім, шчыра кажучы, у выпадку неўраджаю вішань не трэба бедаваць. Па-першае, глыбоцкія дзяўчаты-красуні – самі быццам вішанькі, а па-другое, тое, што выбляюць іх умелыя ручкі – гэта сапраўдны вішнёвы рай. Ягадкі ў глыбоцкіх майстроў атрымліваюцца зайздросныя — вязаныя, пашытыя з розных тканін, валяныя з воўны, сплеценыя з саломкі, бісеру ці намаляваныя так, што хоць у рот кладзі.

Паважаных глыбачан і гасцей горада, якія цэняць вырабы ручной работы, можам правільна скіраваць. Калі вам патрэбны адметнай прыгажосці кухонныя "памагатыя": распісныя ў чырвоных ягадках дошчачкі, лыжкі, лапатачкі, то, калі ласка, — да майстроў Глыбоцкага Дома рамёстваў. Хочацца быць непаўторнай чараўніцай, то зноў сюды – з вішанькамі каралі, завушніцы, брошкі, шпількі. А на доўгую памяць пра першы "Вішнёвы фестываль" у Глыбокім застануцца, падрыхтаваныя ўсімі глыбоцкімі і падсвільскімі майстрамі вымпелы з лёну і саломкі альбо папулярныя ў дзетак і дарослых магніцікі.

Дарэчы, для дзетак будзе радасцю сустрэча з "вішнёвымі" цацкамі, створаныя Глыбоцкім цэнтрам дзяцей і моладзі і маленькімі глыбачанамі. Супрацоўнікі цэнтра падрыхтавалі і падарункі для дарослых: распісныя ў вішаньках фужэры і вазы, сувенірныя веры – яны не толькі ўпрыгожаць інтэр'ер кватэры ці дома, але і зімовымі вечарамі будуць вяртаць у прыемныя імгненні лета... Як і іншыя вішнёвыя творы, прадстаўленыя нашымі ўмельцамі з залатымі рукамі.



**"Вішнёвыя" паненкі з Глыбоцкага Дома рамёстваў: Святлана Скавырка і Кацярына Кляпацкая.**



**Вішнёвая тэма рукамі школьнікаў.**



**Глыбоцкая рамесніца Святлана Зяваліч прапануе ўпрыгожыць ваш інтэр'ер «Вішнёвай кампазіцыяй».**



**"Вішнёвыя" фантазіі майстроў Глыбоцкага Дома рамёстваў.**

**Фота Алены АДЭДЭДЖЫ.**

## Максім Багдановіч

Па-над белым пухам вішняў,
Быццам сіні аганёк,
Б’ецца, ўецца шпаркі, лёгкі
Сінякрылы матылёк.

Навакол ўсё паветра
Ў струнах сонца залатых, —
Ён дрыжачымі крыламі
Звоніць ледзьве чутна ў іх.

І ліецца хваляй песня —
Ціхі, ясны гімн вясне.
Ці не сэрца напявае,
Навявае яго мне?

Ці не вецер гэта звонкі
Ў тонкіх зёлках шапаціць?
Або мо сухі, высокі
Ля ракі чарот шуміць?

Не паняць таго ніколі,
Не разведаць, не спазнаць:
Не даюць мне думаць зыкі,
Што ляцяць, дрыжаць, звіняць.

Песня рвецца і ліецца
На раздольны, вольны свет.
Але хто яе пачуе?
Можа толькі сам паэт.

## Михаил Исаковский

### Вишня

В ясный полдень, на исходе лета,
Шел старик дорогой полевой;
Вырыл вишню молодую где-то
И, довольный, нес ее домой.

Он глядел веселыми глазами
На поля, на дальнюю межу
И подумал: «Дай-ка я на память
У дороги вишню посажу.

Пусть растет большая-пребольшая,
Пусть идет и вширь, и в высоту
И, дорогу нашу украшая,
Каждый год купается в цвету.

Путники в тени ее прилягут,
Отдохнут в прохладе, в тишине,
И, отведав сочных, спелых ягод,
Может статься, вспомнят обо мне.

А не вспомнят — экая досада,—
Я об этом вовсе не тужу:
Не хотят — не вспоминай, не надо,—
Все равно я вишню посажу!»

## Ганна Міклашэвіч

* * *

Профіль вішні у маім акне:
Белая ў суквеццях, як нявеста.
Па чыёй адна стаіш віне?
Жаніха чаму пустуе месца?

Вецер абдымае стройны стан,
Пацалункамі пяшчоціць сонца.
Ты ж, адзеўшы светлы сарафан,
Пазіраеш у бакі бясконца.

«Не ідзе, чаму ж ён не ідзе?» –
Ціха шэпчуць гнуткія галінкі.
Тонуць слёзы ў веснавой вадзе.
Маладосці коцяцца хвілінкі.

Плач пялёсткаў паглынае ціш...
Сумна я акно сваё завешу.
Ты ж з надзеяй на мяне глядзіш:
Можа, што скажу? Мо як суцешу?

## Марыя Кароль

***

Ніхто не кліча зноў
Прыехаць ў вёску.
Ды і каму тут клікаць —
Хоць ты плач!
І плачу я,
Бо хоць і вёска блізка,
Ды некаму так голасна пазваць:
—Ты прыязджай,
Ужо паспелі вішні,
Збіраць іх трэба,
Ставіць на кампот...
То голас мамы
Родны, мілы, блізкі!
Ну, хто так можа
Клікаць на парог?!
І еду я сюды,
Я тут бываю часта —
Не забываю гэты я парог.
А голас мамы, што “паспелі вішні”, —
Жыццёвы напамін
Пра родны мой куток.

## Вольга Ляшкевіч

***

Вішнёвая, салодкая пара!
Вішнёвае варэнне і кампоты!
Зрання шпакоў нагадвае дзятва,
Што ягады зрывае з дрэва ўпотай.

Пунсовыя, чырвоныя плады
У момант таяць, бы цукерка, у роце.
Падзякуем жа небу і зямлі,
Што ўрадзілі вішні ў гэтым годзе!

## Іван Гушчынскі

### Вішні

Стомленае сонца
ў кошык вішань ўпала.
Ой, чаму ж для хлопца
гэтых вішань мала?

Не частуй, красуня,
вішняй каля хаты:
нос суседка суне,
блізка мама, тата.

Пахне вішняй спелай
і салодкай самай
твая шчочка злева,
твая шчочка справа.

Не дрыжы ты голлем,
вішняк чырванюткі.
Ды за ўсё найболей
пахнуць вішняй губкі...

## Мар’ян Дукса

***

Глядзі, які цудоўны свет
суквецця-лісця!
А ты не ўсцешаны як след,
бы страціў выйсце...
Які салодкі пах бяроз
плыве з кюветаў,
якая ўзвышанасць нябёс
і бляск сусветаў.
Як скача промень па траве
у ранак любы.
Якая музыка плыве
з птушынай дзюбы.
Цуд вершыць справу
над зямлёй —
на зло знямогам.
Усё для радасці тваёй
паслана Богам.
І ветру майскага парыў,
і ззянне вішні
для ўцехі сэрца падарыў
табе Ўсявышні.

## Галіна Сутула

### Вішнёвы баль у Глыбокім

Спелым водарам вішнёвым
Напаўняюцца сады.
Сакавіта-адмысловы
Ліпень шчодра-малады.
Раскашуе каралевай
Вішанька глыбоцкая.
Дзе ты: справа, а ці злева
Шчасцейка дзявочае?
Гронкі яркія – гімн лету –
У прыгоршчы просяцца.
Словы шчырыя паэтаў
Ад душы ўзносяцца.
Раскашуе каралевай
Вішня фестывальная.
Свята – справа, свята – злева
Усім запамінальнае!
І куды не кінеш вока
Тут і там – салодкі рай.
Красуе вішня ў Глыбокім –
Багаты будзе ўраджай!
Наша вішня каралеўна
Упрыгожыць фестываль.
Па-глыбоцку дзіўна-спеўна
Кружыцца вішнёвы баль.



Фота Алены АЛЭДЭДЖЫ.

# Вишенки бывают разные...

**_Трудно встретить человека, который не любил бы вишню и как декоративное, и как плодовое дерево. Вспомните, как цвела вишня минувшей весной, какой замечательный дала урожай летом – и можете отправляться в погреб за баночкой вишневого аромата._**

В настоящее время существует более 1.000 сортов вишни, но основу ее сортимента составляют лишь немногие из них. В России ведущее место принадлежит сортам «любская», «подбельская», «гриот остгеймский», «владимирская», «шпанка ранняя». В Беларуси до недавнего времени местная кислая вишня занимала 47% площадей, «владимирская» — 16%, «любская» — 8%.

В США и Канаде популярен сорт «монморанси», а в Германии, Франции и некоторых других странах Западной Европы — «шаттенморелле».

Огромный вклад в селекцию вишни внес И.В.Мичурин. Выведением новых сортов он занялся еще в 1885 году. И почти за полвека создал около 30 сортов, часть из которых до настоящего времени районирована в некоторых областях России.

Белорусские ученые по всему миру отбирают лучшие из помологических сортов. Работы по селекции вишни были начаты в 1927 году Э. П.Сюбаровой. Ею созданы такие хорошо известные сорта, как «Сеянец № 1», «Новодворская», «Кистевая», «Владимирская улучшенная».

С 1965 года более 20 лет селекции вишни посвятила и Р.М.Сулимова. Затем кропотливую работу по сохранению и расширению коллекции продолжила М.И.Вышинская. А теперь ее эстафету подхватил и Александр Таранов. В коллекции РУП «Институт плодоводства», одной из самой богатых в СНГ, уже более 260 сортообразцов вишни отечественной и зарубежной селекции.

В Беларуси районировано 6 сортов вишни — «Новодворская», «Жывіца», «Сеянец № 1», «Памяти Вавилова», «Тургеневка», «Вянок». Из–за массового поражения болезнями исключены из реестра «Любская» и «Норт стар».

Как выглядит вишня, знает каждый. А вот то, что в зависимости от типа плодоношения все сорта вишни делятся на две группы: кустовидные и древовидные, знает далеко не каждый.

**Кустовидные вишни** достигают высоты 2-4 метра, крона их шаровидная, ветви пониклые, образуют густую поросль. Плодоношение у них сосредоточено на однолетних приростах прошлого года, букетных веточек очень мало, что приводит к быстрому оголению ветвей. Продолжительность жизни 15-20 лет.

**Древовидная вишня** достигает высоты более 5 метров. Тип плодоношения у нее смешанный, то есть



примерно 50% урожая формируется на прошлогодних однолетних побегах и столько же на букетных веточках (образованиях длиной 0,5-1 см с сильно укороченными междоузлиями), на концах которых закладываются 1-2 ростовые почки, а по бокам 4-10 цветковых. Они плодоносят в течение 3-4 лет, затем плодоношение уменьшается, и через 7-8 лет почки отмирают. Продолжительность жизни древовидных вишен около 30 лет.

Вишня живет 2 — 3 десятилетия, но больше 15 — 20 лет лучше дерево не эксплуатировать.

**Кстати**

**_Сорта вишни по цвету сока делятся на морели, или гриоты — с темноокрашенным соком и аморели — с неокрашенным._**

# Ухаживайте за вишнёвыми деревцами, как за барышнями

**_Посадка по требованию_**

Лучшими для посадки вишни являются возвышенные, ровные места или южные, юго–восточные, юго–западные склоны, вблизи заборов, строений, где создается более теплый микроклимат и большее снеговое укрытие. Вишня — растение светолюбивое, хотя и переносит некоторое затенение.

Основная масса корней вишни расположена на глубине 15-70 см. А потому лучшими для нее будут суглинистые и легкие супесчаные почвы, проницаемые для воздуха, влаги и хорошо прогреваемые солнцем. На тяжелых почвах вишня растет плохо, недолговечна и дает плохие урожаи. Идеальная кислотность — pH 6,5 — 7,0.

Вишня совершенно не выносит заболоченных мест. Грунтовые воды должны залегать на глубине не менее 1,5 — 2,0 м от поверхности почвы.

**_По всем правилам_**

Лучший посадочный материал — 1-летние здоровые саженцы с 3-4 разветвлениями скелетных ветвей. Саженцы лучше заготавливать осенью, а высаживать ранней весной, храня в прикопе. При осенней же посадке (особенно в поздние сроки) растения очень часто погибают зимой.

Осенью готовят и посадочные ямы шириной 70-80 см и глубиной 50-60 см. На дно насыпают слой плодородной почвы, тщательно перемешенной с 15-30 кг органических удобрений (компоста или перепревшего навоза), 200 г фосфора, 60 г калия. Вместо калийных удобрений можно использовать золу (0,5 кг на посадочную яму). Свежий навоз, азотные минеральные удобрения и известь в ямы не вносят!

Сразу после посадки, чтобы сохранить соотношение между надземной частью и корнями, нарушенными выкопкой, основные ветки и проводник обрежьте примерно на 1/3 их длины: без обрезки после посадки ветви слабо утолщаются и дают мало обрастающих веток.

**_Дозированное питание_**

Если посадочная яма была заправлена должным образом, то на первый и второй год растения только подкармливают азотными удобрениями — 15-30 г аммиачной селитры на весь приствольный круг диаметром до 1,5 м.

Через 3-4 года после посадки, когда начнется плодоношение, вносят на 1 кв. м проекции кроны по 4-6 кг органических удобрений (1 раз в 4 года), по 9 г азота и калия, 6 г фосфора. При наступлении полного плодоношения нормы увеличивают в 1,5 раза.

Поскольку азотные удобрения очень быстро вымываются в нижележащие слои почвы, то эффективнее рассыпать их по поверхности под очередное рыхление на глубину 10 — 12 см. Или же перед дождем, но уже не заделывая в почву. Если земля сухая, удобрения разводят водой. Лучшие результаты дает не одновременное, а дробное внесение азота — ранней весной и в начале лета.

Фосфорные и калийные удобрения мало опускаются в нижележащие слои, поэтому их вносят под перекопку осенью.

Очень важна для вишни и влага. При сухой погоде эффективны поливы сразу после цветения (конец мая — начало июня), через 3-4 недели после цветения (во второй половине июня) и при необходимости в июле. И в то же время из-за излишка влаги в июле могут растрескиваться плоды. Для лучшей перезимовки при сухой погоде важен и влагозарядковый полив в сентябре — начале октября. Почву надо увлажнить на глубину 40 см, выливая за один раз в среднем 50 — 60 л на 1 кв. м.

**_Стрижка для... урожая_**

Без правильной и систематической обрезки на хороший урожай вишни можно не рассчитывать. Лучше всего проводить ее ранней весной — до начала пробуждения почек. Если же зима была суровая, и деревья подмерзли, обрезкой займитесь после пробуждения почек, чтобы точнее определить пострадавшие от мороза части ветви.

Существует два основных способа обрезки: укорачивание и прореживание. В первом случае мы удаляем часть прироста. Прореживание же заключается в удалении сухих, поломанных, больных, трущихся, перекрещивающихся, растущих в нежелательном направлении или под острыми углами ветвей.

Срезая ветви, не оставляйте пеньков. Они растрескиваются, загнивают, мешают скорейшему зарастанию ран. Косые срезы значительно увеличивают площадь раны, хуже и дольше заживают. Не забывайте все спилы замазать садовым варом или водно–дисперсионной краской.

Первые 5-6 лет обрезкой мы лишь формируем деревья, стараясь не ослабить общего прироста и не задержать начала плодоношения.

В зависимости от силы приростов, возраста растений и степени оголения ветвей первую омолаживающую обрезку проводят на 2-5–летнюю древесину. Все скелетные ветви кроны и большую часть полускелетных разветвлений переводят на здоровые, хорошо растущие и удобно расположенные боковые ответвления или достаточно развитые букетные веточки.

В зависимости от срока эксплуатации вишневых деревьев крону омолаживают 1-2 раза, а в промежутках (при необходимости) проводят санитарную обрезку.



**Хорошего урожая!**

# Ягодка из древних столетий

**_Во многих песнях, стихах, пьесах, сказках и рассказах нашлось место для чудесной вишни. Это настоящее признание истинно всенародной любви, которой нет ни у одного артиста или короля._**

Само слово «вишня», скорее всего, происходит от греческого «виссивия» и «виссивос», что означает «вишнёвый» или «багряный». Вишня и черешня составляют единый род. Только в славянских языках для них существуют отдельные названия. У немцев, французов и англичан черешня не имеет особого названия. В этих странах ее просто именуют сладкой вишней в противоположность вишне кислой, т. е. обычной.

Название рода Cerasus (в латыни произносимое как «церазус») происходит от города Керасунд – одного из портов на побережье Малой Азии. Именно оттуда, по древним текстам историка Плиния, она привезена в Рим консулом Лукуллом – римским полководцем, покорившим Понтийского царя Митридата Великого в 74 году до нашей эры. Вишнёвое дерево воины несли как знамя перед Лукуллом во время его триумфального въезда в Рим. Итак, это случилось в первом веке до нашей эры. Во времена Плиния культура вишни стояла уже на высоком уровне. По крайней мере, он описывает 10 сортов, которые разводились в садах Рима.

Позже вишня попала в другие страны Европы. Во Франции она стала широко известна в восьмом веке нашей эры.

А в Киевской Руси вишней увлёкся киевский князь Юрий Долгорукий. Ведь это именно его заслуга — появление под Москвой роскошных вишнёвых садов. Говорят, его сын Андрей Боголюбский привёз вишню из Суздаля и заложил большой сад в своей вотчине – селе Боголюбово. Отсюда и получила свое начало знаменитая теперь Владимирская вишня. Знаменитый «Патриарший сад» во Владимире был заложен в XVI веке исключительно вишней. В Домострое, составленном Сильвестром, в первой половине XVI века вишня рекомендовалась для разведения. Да и сейчас почти во всех странах-наследницах Киевской Руси «вішнёвыя садочкі» – обязательный атрибут сельского пейзажа. Многие наши люди просто не мыслят свой дом без окружения изящных вишнёвых деревьев.

В Беларуси на долю вишни приходится менее 1% плодовых насаждений и она занимает четвертое место после яблони, груши и сливы.

# От цветения до сбора урожая...

Пыльца вишни, как и других плодовых культур, «тяжелая», и ветер не может переносить ее с растения на растение. Эту работу выполняют пчелы и шмели. Если насекомых нет, то какими бы благоприятными ни были условия для цветения, хорошего урожая не ждите.

По скороплодности вишня лишь немного уступает другим ягодным культурам. Привитые скороплодные сорта дают первый урожай уже на 2-3-й год после посадки. В урожайные годы с одного дерева можно собрать 30-70 кг плодов.

От цветения до сбора урожая (в зависимости от сорта) проходит от 30 до 75 дней. В центральной части Беларуси самые ранние сорта созревают в середине или третьей декаде июня, ранние — в конце июня — начале июля, средние — в середине июля, поздние — в третьей декаде июля — начале августа, очень поздние — в первой декаде или середине августа.

Вишню надо собирать без плодоножек. Если же хотите, чтобы ягоды немного полежали, то тогда срезайте их ножницами, захватив 2/3 плодоножки. Снимать плоды лучше всего утром, пока они еще не нагрелись. Не стоит заниматься уборкой и сразу после дождя.

От качества съема зависит урожай следующего года. Если ягоды срывать пучками, то легко оторвать или надломить и саму букетную веточку. А от нее, как известно, и зависит урожай.

Вишня считается самой морозоустойчивой из косточковых пород. При хорошей подготовке к зиме она переносит даже 35–градусные морозы. Критическая для нее температура — минус 38-40 градусов.

# Поздравляем!

*Нину Пимоновну КАТОВИЧ*

Любимая жена, мама и бабушка, от всей души поздравляем тебя с юбилеем!

*Спасибо, родная, что есть ты у нас,*
*Что видим и слышим тебя каждый час,*
*За добрую душу и тёплое слово,*
*За то, что не видели в жизни плохого.*
*Спасибо тебе, наш родной человек!*
*Желаем здоровья на долгий твой век.*

**Муж, дети, зятья, внуки.**

*Алену Сямёнаўну ЯКУБОЎСКУЮ*

Паважаная Алена Сямёнаўна! Віншуем цябе з Днём нараджэння. Ты нарадзілася ў такую дзіўную пару! Мо таму і сама ты, як чалавек, такая дзіўная: адказная, спагадлівая, стрыманая, чулая і добрая сэрцам. Жадаем табе і надалей заставацца такой жа.

А яшчэ зычым табе здароўя, душэўнай раўнавагі, як мага менш жыццёвых праблем і больш радасных імгненняў. Поспехаў табе ва ўсіх справах і доўгіх гадоў жыцця.

**Супрацоўнікі рэдакцыі раённай газеты "Веснік Глыбоччыны".**

# Глыбокае – вішнёвы гарадок

***Глыбоцкія аўтары, паэт Алесь Жыгуноў і самадзейны кампазітар Браніслаў Грамакоўскі, спецыяльна к святу напісалі песню "Глыбокае – вішнёвы гарадок", якая, магчыма, стане гімнам "Вішнёвага фестывалю". Прапануем вашай увазе тэкст песні.***

Куды ні глянеш – сад альбо садок,
Тут прыгажосцю можна наталіцца.
Глыбокае маё — вішнёвы гарадок,
Такая вось вішнёвая сталіца.

*Прыпеў:*
Вішні ў кожным садзе,
Вішні ў тваім паглядзе,
Вішні паспелі у Глыбокім;
Вішні у кожным доме,
Вішнямі мы вядомы
У блізкім замежжы і ў далёкім.

За летам восень просіцца ў радок.
А хочацца пабачыць саду квецень.
Глыбокае маё – вішнёвы гарадок,
Вясновы самы на усёй планеце.
Сады цвітуць, і ружавее даль.
І пачуццём ты поўнішся высокім.
І спадзяёмся мы: вішнёвы фестываль
Штогод збіраць нас будзе у Глыбокім.
*Прыпеў.*

# Праграма «Вішнёвага фестывалю»

***24 – 26 ліпеня***

| | |
|---|---|
| 18.00-20.00 | Гульні, конкурсы, атракцыёны. ***Дзіцячая пляцоўка «Брыганціна».*** |
| 19.00-21.00 | Работа маладзёжнай пляцоўкі. ***Цэнтральная плошча.*** |

***24 ліпеня (серада)***

| | |
|---|---|
| 12.00-14.00 | Вішнёвыя пасядзелкі клуба пажылых людзей «Эдэльвейс» і «Сударушкі». ***Гарадскі цэнтр культуры.*** |

***25 ліпеня (чацвер)***

| | |
|---|---|
| 14.00-21.00 | Дзень кіно «Вішнёвая кінастужка». ***Гарадскі цэнтр культуры.*** |

***26 ліпеня (пятніца)***

| | |
|---|---|
| 10.00-16.00 | Інвестыцыйны форум. ***Дом культуры (вул. Камуністычная,10).*** |
| 17.30-20.30 | Святочная праграма раённай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў дзяржаўных і іншых устаноў «Нам – 50». Вішнёвы кірмаш. ***Цэнтральная плошча.*** |

***27 ліпеня (субота)***

| | |
|---|---|
| 10.00-16.00 | Інвестыцыйны форум. ***Дом культуры (вул. Камуністычная,10).*** |
| 10.00-18.00 | Свята кветак. ***Цэнтральная плошча.*** |
| 10.00-18.00 | Агляд-конкурс падвор'яў «Вишнёвое изобилие». ***Вуліцы Энгельса і Леніна.*** |
| 13.00 | Гашэнне паштовай маркі ў гонар «Вішнёвага фестывалю» ў г. Глыбокае спецыяльным паштовым штэмпелем. ***Цэнтральная плошча.*** |
| 14.00-15.00 | Урачыстая рэгістрацыя шлюбу «Вішнёвае вяселле». ***Цэнтральная плошча.*** |
| 15.00-16.30 | Святочны канцэрт. ***Цэнтральная плошча.*** |
| 17.00-17.30 | Урачыстае закрыццё «Вішнёвага фестывалю». ***Цэнтральная плошча.*** |
| 17.30-19.30 | Выступленне калектываў мастацкай самадзейнасці Падсвільскага гарпасялковага Дома культуры. Аўкцыён «Вішнёвы пірог». ***Цэнтральная плошча.*** |
| 20.00-23.00 | Дыскатэка «Вішнёвыя рытмы». ***Цэнтральная плошча.*** |
| 23.00 | Святочны феерверк. ***Цэнтральная плошча.*** |

√ **У грамадскіх арганізацыях**

# Многаэтапны праект "ЭкаГлыбокае"

***25 ліпеня ў 20.00 на Цэнтральнай плошчы горада раённая арганізацыя РГА "Белая Русь" будзе прэзентаваць новы многаэтапны праект "ЭкаГлыбокае".***

Упершыню ідэя яго правядзення была агучана на рабочым пасяджэнні савета грамадскай арганізацыі, затым – на сустрэчы старшыні райвыканкама Алега Морхата з прадстаўнікамі бізнесу. Замена поліэтыленавых пакетаў, якімі мы ўсе карыстаемся ў паўсядзённі, на біяраскладальныя дазволіць вырашыць праблему ўтылізацыі адходаў, іх складзіравання і перапрацоўкі, што ў сваю чаргу дапаможа не толькі сэканоміць значныя сродкі, але і зробіць наш край больш чыстым, эстэтычна і экалагічна прывабным для пражывання і развіцця турызму.

Падчас прэзентацыі можна будзе ўдзельнічаць у конкурсах і віктарынах, паказаць свае веды і досвед па ўзнятым пытанні і атрымаць на памяць прызы. Біяраскладальныя пакеты, першая партыя якіх колькасцю дзесяць тысяч штук, закуплена, дзякуючы супрацоўніцтву РА РГА "Белая Русь" з прадпрымальнікам Генадзем Каранеўскім. Набыць такія пакеты для карыстання і ў якасці сувеніра можна будзе з 26 ліпеня ў магазінах "Лагуна" г. Глыбокае.

Што датычыць маладзёжных праграм, то 25 ліпеня ГА "БРСМ" запрашае глыбачан і гасцей фестывалю на канцэртную праграму "Вішнёвая сімфонія". У праграме – выступленне сяброў пярвічных арганізацый ГА "БРСМ" раёна, калектыву Бягомльскай школы мастацтваў, узнагароджанне пераможцаў і ўдзельнікаў праектаў "Мой падарунак ветэрану", "Пазітыўныя дарогі".

**Галіна СУТУЛА.**

# Полезная ягодка

Наши предки считали вишню магическим деревом. Знахари рекомендовали занедужившим тереть о её ствол больные места. Вишневый сок добавляли в молоко и воду, а отведавший такой напиток обретал силу неимоверную. Этой же водой омывали вымя коров и коз, чтобы они лучше доились, а молоко было жирным и вкусным.

Из коры варили с сахаром, луком и конопляным семенем кашу, половину которой давали больному, а вторую бросали в реку, чтобы болезнь «уплыла» прочь. Зола от сжигания вишни также считалась лечебной — в ней катались для излечения от кожных болезней. Смешивая золу с водой, готовили напиток для детей, способствовавший их быстрому росту.

С давних времен любят вишню не только за красоту, но и за великолепный вкус её плодов, за её лечебные свойства, используя всё — корни, кору, веточки, камедь (вишневый клей), листья, плоды, косточки и цветки.

***«Вишнёвая» медицина:***

— полезно употреблять 700-800 гр. свежих ягод в день при анемии, стенокардии, артериальной гипертензии, атеросклерозе, во избежание инсульта и инфаркта;

— отлично утоляет жажду вишневый сок, снимает тошноту и улучшает пищеварение, снижает температуру. Способствует отхождению мокроты, облегчает кашель. Вишневым соком, слегка разбавленным водой можно полоскать горло при ангине;

— при сильных стрессах и психических расстройствах из плодов вишни делают напиток. Берут 1 стакан сушёных ягод вишни, 1/3 стакана цветков душицы, 1/4 стакана чая каркадэ. 1/2 стакана этой смеси заливают 0,5 л. воды,15 мин. варят под крышкой, настаивают 1 час, процеживают. Добавляют 1-2 ч.л. мёда и принимают напиток по 1/2 стакана 2 раза в день;

— при вирусном гепатите, артрите, подагре делают отвар листьев вишни. Заливают 2 ст.л. листьев 1/2 стакана молока, 10 мин. варят на слабом огне, процеживают, пьют в течение дня небольшими порциями;

— для поддержания молодости и тонуса кожи вишневые веники используют в бане. Для изготовления веников берут молодые побеги вишневых деревьев – их срезают в мае-июне.

***«Вишнёвая» косметология:***

— для нормальной и жирной кожи лица делают маски. 10-15 ягод растолочь в ступке, смешать с крахмалом(1 ст.л.) на 20 мин. нанести на лицо и смыть прохладной водой. Поры уменьшатся, кожа станет свежей и отдохнувшей;

— можно нанести на лицо просто кашицу из ягод и делать это каждый день. Через 2-3 недели кожа будет молодой и упругой;

— для волос — укрепляющая маска. Разотрите вишню в эмалированной посуде, отожмите из этой массы сок, добавьте 2 ст.л. крахмала, перемешайте. Нанесите на волосы полученную смесь, затем повяжите голову полиэтиленовой пленкой и махровым полотенцем. Через 40 мин. вымойте голову шампунем, а потом ополосните её слегка подкисленной водой (1 ст.л. уксуса или лимонной кислоты на 1 л. воды).

# Топ-5 фактаў пра вішню

Цікава, якія сакрэты хавае гэтая, усім вядомая, але такая карысная і смачная ягада?

1. Назва вішні ў розных еўрапейскіх мовах паходзіць ад назвы невялікага гарадка Керасунда. Ад слова «cerasi» і адбыліся ангельскае cherry, французскае cerise, нямецкае Kirsche, іспанскае cereza, італьянскае ciliega, і нават рускае -- чарэшня.

2. Чарэшня -- гэта асобны від вішні, які па-іншаму называецца Вішня птушыная. У Ізраілі, напрыклад, чарэшню называюць салодкай вішняй. Звычайная вішня ў батаніцы называецца Вішня кіслая. Вельмі падобна на праўду!

3. І ягады, і лісце вішні ўтрымліваюць прыродныя антыбіётыкі, менавіта таму нашы продкі прыкладвалі патоўчанае лісце вішні да парэзаў – і яны хутчэй гаіліся.

4. Тыя ж хімічныя рэчывы, якія надаюць колер вішні, здольныя палегчыць боль лепш за аспірын. Ужыванне каля 20 ягад вішні ў дзень здольна знізіць запаленчыя працэсы і галаўны боль.

5. З драўніны вішні робяць выдатныя мастацкія вырабы, курыльныя трубкі, мундштукі, бо яна валодае прыгожай тэкстурай.

**«Веснік Глыбоччыны»**
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Глыбоцкі раённы выканаўчы камітэт, раённы Савет дэпутатаў.
Выходзіць у сераду і суботу.
Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйны № 73 ад 3 сакавіка 2009 г. Індэкс 63968.
Аўтары нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.

Адрас: 211800, г. Глыбокае, вул. Чырвонаармейская, 2.
E-mail: glubokoe@vitebsk.by
ТЭЛЕФОНЫ
рэдактара -- 2-13-39,
намесніка рэдактара -- 2-24-85,
адказнага сакратара і аграпрамаддзела -- 2-11-46,
аддзела сацыяльных праблем і сувязей з грамадскасцю -- 2-11-45,
бухгалтэрыі -- 2-11-48 (факс),
аддзела рэкламы -- 2-13-39 (факс).

Р/р 3012024925589 у ЦБП № 208 ф-ла № 216 ААТ «ААБ Беларусбанк» у г. Полацку. МФА 648, УНП 300022458, АКПА 02478065

ISSN 2075-7948

Галоўны рэдактар
Ганна Нікандраўна КАПШУЛЬ

Дызайн і вёрстка: Варвара Ваяводава.
Карэктар: Іван Букоўскі.

Падпісана ў друк 23.07.2013 г. у 17.00. Набрана на настольна-выдавецкай сістэме ў рэдакцыі, надрукавана афсетным спосабам ва УПП «Віцебская абласная друкарня»: (210015, г. Віцебск, вул. Шчарбакова-Набярэжная, 6). Заказ № 5325.
Тыраж 7140.